№ 68 (1133)
Чацвер, 12 красавіка 2001 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць — 5 разоў у тыдзень
Кошт: у кіёсках і кромах — 100 руб., у індывідуальных гандляроў — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб Колас

Народная Воля

Освітительное оборудование лампы кабель
5-(017)-213-70-21
5-(017)-213-70-13
Кальченко & К°

Надвор'е

Сёння ўдзень па краіне захаваецца воблачнае з праясненнямі надвор'е, месцамі дажджы. Вецер паўночна-заходні, 5—8 м/с. Тэмпература паветра ў Гродне, Брэсце — +5...+7, Віцебску, Мінску — +7...+9, Магілёве — +9...+11, Гомелі — +15...+17.

У наступныя двое сутак воблачна з праясненнямі, месцамі ападкі, пераважна мокры снег. Вецер паўночны, 5—10 м/с, 14-га парывы да 14. Тэмпература паветра 13-га ўначы — -2...+3, удзень — +3...+8, 14-га ўначы — 0...-4, удзень +1...+6.

Пейджинговую связь редакции обеспечивает
МОБИЛКОМ
пейджинг-система
(017) 222-46-51
(017) 222-46-52

Дачакаліся Вялікадня!

На парозе светлае радаснае свята Уваскрэсення Хрыстова

Бадай, ніводнае свята ў разуменні і адчуванні беларускага народа не мае такога глыбокага сімвалічнага сэнсу, як Вялікдзень. Вялікдзень — гэта ў першую чаргу свята ў памяць Уваскрэсення Хрыстова. Але, апрача свайго рэлігійнага зместу, мае яно ў народным разуменні і іншыя аспекты.

Супадаючы ў часе якраз з пачаткам вясны, калі замерзлая ў зімовым сне прырода прачынаецца да новага жыцця, Вялікдзень з'яўляецца сімвалам усялякага адраджэння, усялякага ўваскрэсення. І з гэтай прычыны з'яўляецца ён святам радасці, святам вяселля. Нездарма адна з найбольш распаўсюджаных песень пачынаецца словамі: "Вясёлы дзень для нас настаў...".

Другім своеасаблівым момантам Велікоднага свята ёсць яго народны, можна сказаць, нацыянальны характар. Бо з Вялікаднем звязана мноства народных звычаяў, абрадаў і песень, якія гэтаму святу ў беларускай народнай творчасці прызначаюць важнае месца. Дастаткова ўспомніць толькі беларускіх валачобнікаў, якія ў Велікодную ноч ходзяць ад хаты да хаты, спяваючы пад вокнамі валачобныя песні, што глыбока ўкараніліся ў народнай творчасці.

Мы, дзеці свайго пакалення, гадоў сорак таму баяліся прынесці ў школу чырвонае велікоднае яечка, але тым не менш амаль што ў кожнай хаце адзначалі гэтае свята. Дзеці з задавальненнем гулялі "ў яйко", збіралі іх, з ахвотай мыліся з ім, каб быць здаровымі і дужымі. І гэта была не толькі дзіцячая забава, але яшчэ нешта да болю роднае і светлае... Як чаканне лепшага жыцця, лепшай долі. Бабуля мая так і казала, пачынаючы адведваць "свянцонку": "Ну, дзякуй Богу, дачакаліся Вялікадня!". Бо да свята сапраўды трэба было дайсці сваім цярпеннем, прабачэннем, устрымліваючыся ў Вялікі пост ад сварак, абгавораў, лепшай (мясной) ежы. І толькі ў цярпенні чалавек можа зразумець другога чалавека, нават свайго ворага, бо становіцца лепшы сам.

Беларускі народ, як Хрыстос, нясе цяжкі крыж з яго сімвалам уваскрэсення ўсялякай духоўнай сілы, якая, маючы ўсе жыццятворныя задаткі, ніколі памерці не можа. У беларусаў ёсць жыццёвая сіла, непераможны дух, незнішчальныя здольнасці да прагрэсу, што праверана часам. Беларусы жывуць ва ўсім свеце: Аляксандр Надсан — у Англіі, Барыс Кіт — у Германіі, Янка Запруднік і Вітаўт Кіпель — у ЗША, Алесь Алехнік — у Аўстраліі, Раіса Жук-Грышкевіч і Кастусь Акула — у Канадзе, Міхась Наумовіч і Віктар Жаўняровіч — у Францыі, Вячаслаў Ігнаценка — у Малдове, Зоя Смаршчок і Лаўрэн Клыбік — у Бельгіі, Аляксандр Баршчэўскі і Чэслаў Сэнюх — у Польшчы, Хведар Нюнька і Галіна Войшік — у Літве, Вячка Целеш і Станіслаў Валодзька — у Латвіі, Мікалай Нікалаеў, Валянцін Грыцкевіч, Аляксей Каўка — у Расіі, Павел Атрушкевіч — у Казахстане. Гэты спіс можна доўжыць і доўжыць...

І гэтыя беларусы, рассеяныя па ўсім свеце як тыя зярняткі, не могуць не даваць плён. Як не можа нічога памерці ў прыродзе, што толькі здольнае жыць. Не страцілі беларусы ў іншых краінах родную мову, размаўляюць на ёй, пішуць вершы, кнігі, не забыліся пра родныя краявіды, бо пішуць мастакі карціны; не адракліся ад нацыянальнай культуры, бо спяваюць і танцуюць у беларускіх ансамблях у Бельгіі, Расіі, на Украіне...

Не можа загінуць на свеце памяць, дабро, праўда, любоў. Усе гэтыя каштоўнасці могуць быць пераможаны толькі часова, але канчаткова перамога заўсёды застаецца за імі. Такі ўжо закон прыроды і людскога жыцця.

Галіна ІВУЦЬ,
навуковы супрацоўнік Нацыянальнага навукова-асветнага цэнтра імя Ф.Скарыны, загадчыца музея "Беларусы ў свеце".

P.S. *Мы запрашаем у гасцінныя сцены Скарынаўскага цэнтра ўсіх беларусаў, якія жывуць па-за межамі нашай краіны і не парвалі сувязь са сваёй Бацькаўшчынай, працуючы дзеля яе духоўнага росквіту.*

БОЛЬШОЙ КОЛХОЗ

Реформируем сельское хозяйство — улучшим жизнь людей

Геннадий УСЮКЕВИЧ, председатель Постоянной комиссии по аграрным вопросам и социальному развитию села Верховного Совета Республики Беларусь 13-го созыва, кандидат технических наук

Всем известно, что в 1985—1991 годах по производству важнейших видов сельскохозяйственной продукции на душу населения Беларусь превосходила аналогичные среднеевропейские показатели. В расчете на каждого человека производили в среднем ежегодно по 114 килограммов мяса, более 700 килограммов молока, около 800 — зерна, 115 — овощей и 1200 килограммов картофеля.

Дискриминационная экономическая политика правительства Лукашенко по отношению к сельскому хозяйству привела к тому, что инвестиции государства в агропромышленный комплекс сократились в десять раз — с 16,5 миллиарда в рублевом эквиваленте в 1990 году до 1,7 миллиарда в 2000 году. Изношенность основных фондов достигла 70—80%, число работающих в отрасли сократилось более чем в два раза. Развеян миф о том, что колхоз (госхоз) кормит страну. По данным официальной статистики за последние годы, имея 16% земли в собственности, крестьяне производят более 80% картофеля и овощей. Из частных хозяйств на продовольственный рынок поступает более 40% молока и 30% мяса.

Большая половина колхозов и госхозов традиционно убыточны. Их долги составили более чем полтриллиона рублей. Кредиторская задолженность в пять раз превышает дебиторскую. Все эти годы постоянно снижается эффективность сельскохозяйственного производства. Добрались до того, что, как утверждают экономисты Минсельхозпрода, государственная поддержка АПК на 10—15% превышает стоимость производимой валовой продукции. Некоторые кабинетные горе-управленцы пытаются объяснить это явление бесхозяйственностью руководящих кадров сельскохозяйственного производства. Да, есть элементы бесхозяйственности, но они — результат низкого уровня трудовой и технологической дисциплины, организации труда и управления. Такое было во все времена.

Очень трудно организовать специфическое сельскохозяйственное производство, если по полгода не выплачивать людям и без того мизерную зарплату. Тяжело образцово организовать производство, если большинство работающих в сельском хозяйстве людей трудятся без выходных и в экстремальных условиях. Но не это главное. Суть состоит в том, что нынешняя власть лишила организаторов и технологов, руководителей и специалистов сельскохозяйственного производства не только экономической свободы, права продавать произведенную продукцию по рыночным ценам наиболее выгодному потребителю. Она фактически лишила их юридических прав распоряжаться финансами. Трудно себе представить, до какого маразма дошла вертикаль на уровне района, когда по прямому указанию председателя райисполкома молочный завод не отдает колхозам и госхозам деньги за проданное ему молоко. Отделение банка изымает эти деньги вопреки желанию руководителя хозяйства и перечисляет их тому, кому считает нужным председатель райисполкома. Это значит, что председатель райисполкома стал распорядителем финансовых средств колхоза — то есть превратился в руководителя колхоза районного масштаба. А район превращен в большой колхоз.

Председатели колхозов и директора госхозов, лишенные юридической и финансовой самостоятельности, фактически превращены в бригадиров. Кто в таком случае должен отвечать за развитие и экономическое состояние предприятия: выплату зарплаты колхозникам и рабочим госхозов? А как вести воспроизводство, когда руководитель не имеет права распоряжаться оборотными средствами своего предприятия? Это право отнял у него председатель райисполкома. До такого абсурда довела управление сельскохозяйственным производством нынешняя власть. И еще хватает совести спрашивать с руководителей хозяйств, почему не вовремя выдается зарплата, почему не за что купить горючее, минеральные удобрения! Об этом государственном рэкете знают и способствуют ему областные губернаторы и республиканское руководство. Это значит, что государство Республика Беларусь за последние годы фактически превратилось в Большой Колхоз, которым руководит правление колхоза и его руководитель с соответствующим менталитетом урожденного единоначальника и распорядителя всеми материально-денежными ресурсами. Подход такой: хочу — дам, хочу — не дам. Вырастили, произвели продукцию, а я ее заберу за полцены. А денег вовсе не отдам. Или отдам только тому, кому посчитаю нужным. Налоговые льготы кому хочу, тому и дам по списку, утвержденному лично мной.

Анализируя управленческий абсурд, лишающий должностных обязанностей руководителей и технологов сельскохозяйственного производства, так и хочется спросить: а где прокуроры, где суды, где ведомственные юридические службы всех уровней? Если вы независимы, почему не ставите на место, не судите представителей власти, которые мешают работать производству, игнорируют все законодательные акты, начиная от Устава колхоза, Закона о Государственном предприятии, заканчивая Гражданским кодексом Республики Беларусь?

(Окончание на 2-й стр.)

Фото IREX/ProMedia.

НАВІНЫ

Ярмошына ўразіла Фішэра

Рэалізацыя прэзідэнцкага дэкрэта № 8 "Аб некаторых заходах па ўдасканальванні парадку атрымання і выкарыстання замежнай бязвыплатнай дапамогі" прывядзе да негатыўных наступстваў для Беларусі. Такое меркаванне выказаў віцэ-прэзідэнт Міжнароднай Хельсінкскай федэрацыі (МХФ) Ульрых Фішэр на прэс-канферэнцыі, якая прайшла ў офісе Беларускага Хельсінкскага камітэта ў Мінску.

"Сталая дэмакратыя вызначаецца тым, што не проста прымае, а вітае крытыку ў свой адрас", — зазначыў Фішэр. З гэтай нагоды ён падзяліўся ўражаннямі аб сваёй сустрэчы са старшынёй Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзіяй Ярмошынай. На гэтай сустрэчы абмяркоўваліся, у прыватнасці, пытанні аб магчымасці свабоднага назірання за ходам прэзідэнцкіх выбараў і аб наступствах рэалізацыі згаданага дэкрэта. Прадстаўнікам МХФ, па словах Фішэра, было "крыўдна" даведацца аб пазіцыі беларускіх улад, якія расцэньваюць інтарэс, праяўляемы замежнай грамадскасцю да выбараў, як умяшальніцтва ва ўнутраныя справы краіны. "Назіранне за выбарамі насамрэч з'яўляецца часткай агульнапрынятых дэмакратычных працэдур і не можа трактавацца як умяшальніцтва ў выбары, паколькі яго вынікі не могуць паўплываць на вынікі выбараў", — сказаў Фішэр.

Генадзь БАРБАРЫЧ.

"Дзеці свету — Белавежскай пушчы"

"Форд Мотар Компані" падвяла вынікі штогадовага конкурсу на атрыманне прэмій у галіне абароны навакольнага асяроддзя і культурна-гістарычных каштоўнасцей 2001 года.

Як паведаміў БелаПАН каардынатар па сувязях з грамадскасцю "Форд Мотар" Дзмітрый Мокшын, з моманту абвяшчэння конкурсу ў канцы лютага на разгляд журы прыйшлі некалькі сотень заявак з Расіі і Беларусі ад прыватных асоб і некамерцыйных арганізацый. Яны падаваліся па чатырох катэгорыях: "навакольнае асяроддзе" (ахова флоры і фауны), "культурная спадчына" (ахова гістарычных помнікаў і захаванне народных традыцый і промыслаў), "інжынерна-канструктарскія распрацоўкі" (праекты, скіраваныя на змяншэнне выкарыстання карысных выкапняў), "маладзёжныя праекты" (праекты па любой з пералічаных тэм, аўтары якіх не старэйшыя за 18 гадоў).

Прэмію ў катэгорыі "маладзёжныя праекты" памерам 3 тысячы долараў атрымаў беларускі праект "Інтэрнет-сайт "Дзеці свету — Белавежскай пушчы". Апрача гэтага, заахвочвальнымі прэміямі адзначаны два расійскія праекты.

Аляксей АРЭШКА.

Справа прафесара Бандажэўскага

Гамяльчанін Андрэй Патапаў, які выступае сведкам па крымінальнай справе ў дачыненні да прафесара Бандажэўскага, іншых супрацоўнікаў Гомельскага медінстытута і члена/ў прыёмных камісій, заявіў, што пісаў заяву аб дачы ім хабару за паступленне ў ВНУ пляменніцы пад дыктоўку супрацоўнікаў абласнога ўпраўлення Камітэта па арганізаванасці і карупцыі пры МУС Беларусі.

Сведка патлумачыў ваеннай калегіі Вярхоўнага суда Рэспублікі Беларусь, якая разглядае справу, што ў кабінеце, дзе ён пісаў заяву, таксама ляжалі і ўзоры іх правільнага напісання. Другая сведка Антаніна Дашкевіч паказала, што за паступленне дачкі ў медінстытут яна перадала адной з падсудных 2 тысячы долараў. Аднак яе дачка ў ВНУ не паступіла, і грошы поўнасцю вярнулі.

Ірына ШАНЦАВА.

Дырэктарат кансалідуецца

Кіраўнікам прадпрыемстваў, арганізацый і аб'яднанняў рэкамендавана заярнуць першачарговую ўвагу на неабходнасць узбуйнення вытворчасцей, узгодненае і сумеснае развіццё тавараправодных і сервісна-бытавых сетак, кансалідацыі намаганняў для прыцягнення інвестыцый і рацыянальнага выкарыстання ўнутраных рэзерваў.

Такое рашэнне прыняў Міжнародны клуб дырэктараў пры Беларускай навукова-прамысловай асацыяцыі на сваім пасяджэнні. Пасяджэнне было прысвечана праблемам інвесціравання і шляхам забеспячэння канкурэнтаздольнасці прадукцыі таваравытворцаў Беларусі, Расіі і іншых краін СНД.

Удзельнікі пасяджэння рэкамендавалі таксама кіраўнікам — членам клуба актывізаваць працу па рэструктурызацыі неканкурэнтаздольных вытворчасцей, правесці аб'ектыўную ацэнку маёмасці прадпрыемстваў і дамагацца пераўтварэння іх па схеме выпуску дадатковага пакета акцый з мэтай прыцягнення дадатковых інвестыцый.

Удзельнікі пасяджэння зазначылі, што дынаміка фінансавых паказчыкаў летась прыкметна пагоршылася. Колькасць стратных прадпрыемстваў узрасла з 8,8 працэнта ў 1999 годзе да 18,8 працэнта, а ў лёгкай прамысловасці — да 33 працэнтаў. Рэнтабельнасць вытворчасці знізілася з 17,1 да 15,7 працэнта, у тым ліку ў машынабудаванні — да 14,4 працэнта; у аўтамабільнай прамысловасці яна склала 8,8 працэнта, станкабудаванні — 8,7 працэнта. Крадыторская запазычанасць узрасла ў 3,6 раза і на канец мінулага года склала 2,5 трыльёна рублёў. Для выканання задач, пастаўленых Праграмай сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 2001—2005 гады, вытворцам неабходны рывок у павышэнні канкурэнтаздольнасці прадукцыі.

Ірына САЗАНОВІЧ.

"Народной воле" требуются
молодые, энергичные, коммуникабельные руководители новых рекламных проектов.
Обращаться в рекламный отдел УП "Народная воля" по тел.: 206-69-04, 206-69-06.

АКЦЫЯ

Пойдзем на "Чарнобыльскі шлях-2001"

Сябрамі КРДС вырашана падаць у Мінгарвыканкам заяву з просьбай даць дазвол на правядзенне 26 красавіка з 17.00 да 19.30 мерапрыемстваў, звязаных з 15-й гадавінай чарнобыльскай катастрофы.

Лозунгі мерапрыемства: "За Беларусь — дзеля будучыні", "Беларусі — жыць!".

Аўтары заявы хочуць, каб улады дазволілі людзям сабрацца на плошчы Свабоды ў 17 гадзін. І тут жа з 17.30 да 18.30 правесці гадзіну смутку.

У заяве выказваецца просьба і наконт дазволу на шэсце для перадачы петыцыі па маршруце плошча Свабоды—вуліца Леніна—праспект Ф.Скарыны—плошча Незалежнасці. Петыцыя па праблемах Чарнобыля павінна быць перадана ў Дом урада.

Няўжо і на гэты раз Мінгарвыканкам зацягне разгляд заявы да апошніх дзён? Нельга, каб людзі да апошняга моманту не ведалі, куды ісці і як наогул будзе арганізавана правядзенне "Чарнобыльскага шляху-2001".

Ул.інф.

"Вясенні тыдзень дабра"

З 15 па 22 красавіка валанцёрскі цэнтр "Крок насустрач!" міжнароднай грамадскай дабрачыннай арганізацыі "Надзея-экспрэс" пры падтрымцы Міністэрства адукацыі Беларусі праводзіць дабрачынную акцыю "Вясенні тыдзень дабра". Яна заклікана аб'яднаць самыя розныя сацыяльныя і экалагічныя мерапрыемствы, праводзімыя гэтымі днямі ў Мінску і краіне грамадскімі арганізацыямі, школамі, сярэднімі і вышэйшымі навучальнымі ўстановамі. Час дабрачыннай акцыі арганізатары прымеркавалі да хрысціянскага Вялікадня (15 красавіка), сусветнага Дня маладзёжнага служэння (21 красавіка) і Дня зямлі (22 красавіка).

У праграме акцыі кожны з дзён тыдня прысвечаны канкрэтнаму віду добрых спраў. Так, 15 красавіка прысвечана "Радасці дарэння" — у гэты дзень мяркуецца надаць увагу адзінокім і іншым маючым патрэбу ў дапамозе і доглядзе людзям. 16 красавіка пройдуць мерапрыемствы ў дзіцячых установах, з дзецьмі-інвалідамі, 17 красавіка будзе прысвечана ўборцы садоў, паркаў і вуліц. 18 красавіка "Крок насустрач!" плануе Дзень прафесійнай дапамогі, арганізуючы бясплатныя кансультацыі і паслугі спецыялістаў, 19 красавіка запрашае ў творчую гасцёўню "Падзяляся дабром", дзе ідэі бескарыслівай дапамогі будуць папулярызавацца праз вершы, музыку, гутаркі. Пятніца, 20 красавіка, будзе прысвечана прапагандзе здаровага ладу жыцця праз спаборніцтвы і гутаркі на аздараўленчыя тэмы, у суботу пройдуць мерапрыемствы, закліканыя ўцягнуць моладзь у добраахвотніцкую дзейнасць, папулярызаваць ідэі валанцёрства. 22 красавіка, у Дзень зямлі, валанцёры прапануюць заняцца дапамогай "братам нашым меншым" — вывешваннем шпакоўняў, арганізацыяй экалагічных святаў, заалагічных выстаў.

Ужо выказалі жаданне ўзяць удзел у праграме больш за 30 грамадскіх арганізацый, адукацыйных устаноў і сацыяльных служб; інфармацыя ад патэнцыяльных удзельнікаў працягвае паступаць. Валанцёрскі цэнтр "Крок насустрач!" запрашае далучацца да акцыі ўсіх жадаючых. Арганізатары праекта спадзяюцца, што яго вынікам стануць не толькі канкрэтныя справы, але і рэкамендацыі па арганізацыі валанцёрскага руху, якія змогуць скарыстаць калегі па трэцім сектары.

Святлана НЯСТРАХАВА.

АВАНСЦЕНА

"Главное – деньги, а не человек"

Послание Александра Лукашенко припрезидентскому Национальному собранию сопровождалось взрывами хохота находящихся в пресс-центре журналистов

Полагаю, по этой причине представителей масс-медиа 10 апреля 2001 года не допустили в Овальный зал. Ведь, находясь там, пишущая братия не стала бы сидеть с подобострастными масками, которые были изображены на лицах "сенаторов", "палатников", министров, судей и прочих высокопоставленных вертикальщиков.

Хотя телевидение зафиксировало всего один случай смеха и в самом Овальном зале. Не выдержал министр внутренних дел Владимир Наумов. Расхохотался, когда услышал из уст главы государства распоряжение изымать у региональных "вождей" их жилье, состоящее из двух-трех квартир, объединенных в одну, и реализовывать сии хоромы... сельскому населению.

Похоже, генерал Наумов приказание президента оценил как пиаровский юмор: реквизировать "скромное" жилье областных и районных "князьков" — не проблема, но в какой такой деревне нашего царства-государства можно найти доярку или тракториста, зарплата которых соизмерима со стоимостью жилья региональных "вождей"?

Сам текст послания ничего нового не несет. Он аналогичен всем предыдущим, которые президент Лукашенко зачитывает в парламенте в течение уже двух сроков пребывания у руля государства. За исключением практически полного игнорирования в послании 2001 года вопроса объединения с Россией. Что, собственно, вполне объяснимо: ведь Владимир Путин потребовал от Александра Лукашенко сдать Москве деньгопечатающий станок.

Как только "докладчик" отрывался от текста, разговоры в пресс-центре тут же замолкали. Ведь именно в такие моменты произносились истинные, а не "книжные" слова кандидата №1 в президенты (на третий, между прочим, срок. — **Авт.**).

Так, говоря о честных, прозрачных и демократических выборах главы государства, Александр Лукашенко изрек, что нам не нужны заграничные компьютерные системы фальсификации выборов, мы создадим государственную.

Или:

— я готов ждать, пока вернут деньги: главное — деньги, а не человек;

— макдональдс — гадюшник на перекрестке;

— в наших жилах течет половина русской крови;

— БТ безответственно, нет профессиональной реакции, все сидят и ждут информацию (заметалинскую.— **Авт.**);

— мне не надо денег на избирательную кампанию — у меня достаточно административного ресурса, чтобы провести выборы;

— нападающих на резиденцию президента мы встретим внутри здания (в смысле "мочить" будут не на улице, а в подвалах. — **Авт.**).

Журналистов позабавило демонстративное пренебрежение спецслужб президента к руководству Палаты и к порядкам, установленным в этом квазипарламенте.

У всех представителей СМИ одинаковые аккредитационные удостоверения. Но лукашенковские опричники запустили в Овальный зал только "чэсных", а "нячэсных" — лишь в пресс-центр.

Журналиста Юрия Свирко, попытавшегося пройти следом за корреспондентами БТ, приволокли в пресс-центр силой. Предъявление Юрием Викторовичем "сильным мира сего" аккредитационной карточки успеха не имело.

Глава президентской Администрации Михаил Мясникович ответил, что это не его дело. Говорят, государственный секретарь Совета безопасности Урал Латыпов заявил, что читать по-русски не умеет (действительно, аккредитационные карточки исполнены не на белорусском, а на русском языке. — **Авт.**).

А появление Валерия Шукина вызвало у службы безопасности панику. Пропуск был изъят, и дана грозная команда разобраться на предмет достоверности оного документа. Пропуск оказался всамделишным. Тем не менее поступило распоряжение: в пресс-центр... препроводить! (По сути, под конвоем.— **Авт.**).

"Апофеозом" президентского послания стало "лишение аккредитации при своей персоне" посла Соединенных Штатов Майкла Козака. Главе Администрации тут же в Овальном зале было дано указание не приглашать американского посла на официальные мероприятия с участием главы государства. Так Александр Лукашенко отреагировал на отсутствие этого дипломата в Овальном зале.

Валерий АЛЕКСЕЕВ.

Рэзкі рост захворвання на дыфтэрыю

У 2000 годзе ў Мінску адзначаны рэзкі рост захворвання на дыфтэрыю — вострае інфекцыйнае захворванне верхніх дыхальных шляхоў, якое тоіць у сабе небяспечныя вынікі пры развіцці ўскладненняў.

Як заявіла на прэс-канферэнцыі галоўны эпідэміёлаг камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама Ала Раждзённая, у параўнанні з 1999 годам адбыўся рост захворвання ў 4,7 раза. З 52 выпадкаў па краіне 32 зафіксаваныя ў Мінску. Калі агульнарэспубліканскі паказчык захворання на 100 тысяч насельніцтва — 0,52, то ў Мінску — 1,88.

З чатырох памерлых ад дыфтэрыі двое — жыхары сталіцы, якія памерлі з-за развіцця міякардыту (запаленчага захворвання сардэчнай мышцы). За тры месяцы сёлета на дыфтэрыю захварэлі ўжо шэсць мінчан (усяго па рэспубліцы — 11 чалавек).

Па словах Раждзённай, асноўнай прычынай росту захворвання на дыфтэрыю з'яўляецца несвоечасовая або недастатковая імунізацыя: "Схема імунізацыі была парушана ў больш чым 80 працэнтаў захварэўшых".

У 1993—1995 гадах у Беларусі і іншых краінах СНД адзначаўся эпідэмічны ўздым захворвання на дыфтэрыю. Максімальны паказчык у Мінску быў зарэгістраваны ў 1995 годзе — 4 выпадкі на 100 тысяч насельніцтва. Дзякуючы масавай імунізацыі дарослага насельніцтва захворванне стала рэзка зніжацца. Ужо ў 1996 годзе яно зменшылася ў 2,2 раза. Аднак далёка не ўсе прайшлі поўны курс вакцынацыі, і ў 2000 годзе крывая захворвання зноў пайшла ўверх.

Па словах Раждзённай, далёка не ўсе кіраўнікі прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў з разуменнем ставяцца да пытанняў забеспячэння "эпідэмічнага дабрабыту" на тэрыторыі горада. У прыватнасці, гэта тычыцца вышэйшых навучальных устаноў. Да прыкладу, у такіх буйных ВНУ, як Беларускі дзяржаўны універсітэт, Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт, Мінскі дзяржаўны лінгвістычны універсітэт, доля супрацоўнікаў, якія прайшлі імунізацыю, не перавышае 47—61 працэнта.

"Большасць падлягаючых імунізацыі асоб адмаўляецца ад прышчэпак. Сваю адмову яны матывуюць тым, што ў краіне адсутнічае закон, які б абавязваў грамадзян праводзіць прафілактычныя прышчэпкі", — сказала галоўны эпідэміёлаг. Раждзённая выказала шкадаванне, што ў Беларусі няма закона аб імунапрафілактыцы, які абавязваў бы грамадзян рабіць прафілактычныя прышчэпкі і прадугледжваў санкцыі за ўхіленне.

Дзмітрый УЛАСАЎ.

Народная Воля
12 КРАСАВІКА 2001 г.

ШТРИШОК

Зачем нам second hand

Second hand переводится с английского языка, как "вторая рука", т.е. то, что было в употреблении. Так называются магазины, продающие подержанные вещи. Они пришли к нам после так называемых комиссионок и имеют популярность у населения.

Самый известный second hand Минска находится на Пушкинской, недалеко от магазина "Богатырь". Одежда поставляется сюда из Германии, перед продажей проходит специальную обработку. Лучшие вещи отбираются сразу после поставки и отправляются в Красный Крест. То, что не раскупается, идет в утиль.

Причина, по которой сюда приходят — цена. Она намного ниже, чем на рынке, либо в прочих магазинах. Для сравнения: 1 кг штор стоит здесь 4000 рублей, постель, брюки, байки, свитера — 5000, остальное — 6000. Основную массу покупателей составляют пенсионеры и... дяди с толстыми кошельками. Спрашивается, что они здесь делают? Неужто даме в шубе достойно бывать в таких местах?

Продавщица пояснила так: "А зачем им покупать фирменные вещи в магазине, если можно у нас и дешевле? Тем более качество европейское". Уточню, речь шла о фирме Boss.

Свой интерес к second hand и у пенсионеров. Глупо было бы думать, что здесь они покупают вещи для работы на даче. Этого барахла хватает у каждого. Что же тогда влечет сюда старушек? Ей Богу, ни за что не догадаетесь — за нитками, а точнее — за вязаными изделиями, которые можно распустить, связать из них носки и продать на базаре. Глядишь — и надбавочка к пенсии. Как говорится в народе: "Хочешь жить — умей вертеться". Вот и вертятся, кто как может.

В магазине уютно и чисто. Есть примерочные. Верхняя одежда висит на вешалках. Все остальное расфасовано по коробкам, в которых то и дело роются люди. Только повсюду стойкий запах чего-то чужого, так что хочется поскорее выбраться наружу.

...Из-за ширмы вышла девушка, швырнула в корзину только что примерянный черный лифчик (видно, не подошел), залилась краской и направилась к выходу.

Неужели какая-то тряпка стоит унижения?

Светлана ТЕРЕЩЕНКО,
студентка-журналистка.

Белорус не кровожаден

Не так давно в России была утверждена государственная символика. И никому невдомек, что в гербе России уже символизирована суверенная (пока) Беларусь. Над двумя головами черного двуглавого орла парят три короны. Насколько мне помнится, они олицетворяли: большая корона — Великую Русь (Россию), две малые — Малую Русь (Украину) и Белую Русь (Беларусь). Но наши геральдисты и историки почему-то не заметили этого. А может, и заметили, да услужливо прижали хвосты и промолчали.

Зато сколько визга поднялось вокруг статьи З.С.Позняка в "Народной воле" "Америка для американцев". Сколько помоев вылили А.Зимовский и К° с телеэкрана и по радио на его голову! А ведь автор ничего такого и не сказал, из-за чего можно было бы поднимать такой гам. Он лишь изложил идеи доктрины Монро, осуществленные в США. Эту доктрину, как известно, изложил президент США в своем послании Конгрессу в 1823 году. Благодаря этой доктрине США достигли огромных успехов: прочно утвердили свою государственность, стали экономически мощной державой, заняли ведущее место в международной политике. Нет там ни слова ни о национализме, ни тем более о нацизме. Более того, после претворения доктрины в жизнь в США было запрещено рабство. Нам бы такую доктрину — "Беларусь — для беларусаў". И пусть не трясутся коленки у русских, проживающих в нашей стране. Беларус не кровожаден. История не помнит случая, чтобы в Беларуси кого-либо вешали или убивали. Наоборот — было. И даже на его собственной земле. Достаточно вспомнить 1864 год.

Вот лишь один красноречивый пример. Преемник генерала Муравьева Фон Кампф, объезжая Виленский край в октябре 1865 года и выступая перед общественностью города Гродно, заявил: "Вы должны стать русскими от ног до головы и гордиться званием русский. Такова воля Его Величества. Нельзя колебаться: никакая иная нация жить здесь не имеет права, единственная — только русская. Кто думает иначе, тому нет места в этом крае". (Рота. стр.23, 1997. №26/27. Перевод с польского автора). Каково? Круто? Сравните с высказываниями Зенона Станиславовича? Видимо, не дошли до таких исторических высказываний товарищи "резонаторы" и любители накручивать пружины. По всей вероятности, они читают книжки лишь в красных обложках.

Фальсифицируется в угоду имперскому русскому великодержавию история. Изгнали из Беларуси белорусскую культуру, заменив ее эрзацем, — "национальной по форме и социалистической по содержанию".

На мой взгляд, ситуация намного сложнее, чем она видится некоторым нашим оппозиционным политикам. Дай Бог, чтобы я ошибался. Я и сам искренне хочу, чтобы было все не так.

Анатолий КУЛЕШ.
г.Лида.

У нас все отбирают

Уважаемая редакция!

То, о чем я хочу рассказать, не только моя личная проблема. Это касается довольно большого слоя нашего населения, представителей которого всем известный и "мудрый" политик назвал "вшивыми блохами".

Так вот, 35 лет я была госслужащей, и вот уже 5 лет как влезла в шкуру частного предпринимателя. Не от хорошей жизни пошла на это. Пенсии не хватает на жизнь, да и государство ограбило мою семью: оно не возвратило дочери большую сумму (свой взнос), когда она вынуждена была выйти из кооператива по строительству квартиры.

И вот я сижу на рынке, продаю кое-что. Добавку к пенсии делаю себе сама, ни у кого ничего не прошу, да еще и деньги в бюджет государства даю.

Частные предприниматели (дальше "ЧП") — публика разнородная: здесь и молодые, и бабушки-дедушки, с образованием и без оного и т.п. Но всех объединяет одно: желание заработать на жизнь, чтобы прокормить себя и свои семьи, не ходить по вельможным кабинетам с протянутой рукой, где все равно никто ничего не даст.

Труд наш нелегкий: без выходных, с дальними утомительными поездками, торговля в непригодных для работы условиях, постоянное напряжение при мысли, что где-то рядом ходят налоговики, милиция, полиция, вельможные чиновники из местного "Белого дома", — и все в один миг могут испортить тебе настроение на очень долгое время. Трудно, но работаем, другого выхода нет. Нас теперь в Беларуси не единицы, а целая армия.

Нашему правительству радоваться бы, что такая масса народа сама нашла себе работу, ничего у государства не просит, наоборот, дает. Но получается наоборот. Власть нас не любит. В Беларуси "ЧП" — действительно в положении ЧП: слой отверженных, каста неприкасаемых. Мы — будто не граждане этой страны. У нас все отбирают. Отбирают заработанное своим трудом.

В нашем городе каждый месяц — новая плата за торговое место на рынке. Администрация рынка объясняет: нам сказали, что мы имеем право повышать плату каждый месяц. Вы поняли что-нибудь? Я — нет.

Налог растет тоже. И конца этому не видно. Государство хорошо умеет делать одно — отбирать, обирать, грабить. Нас, "ЧП", постоянно держат в напряжении. Бьют и плакать не дают. Нас душат, а мы все боимся поднять голос, дружно выступить с мирной, но решительной акцией протеста.

А.Лукашенко пообещал: в 2001 году средняя зарплата будет 100 долларов. В эту обещаловку может поверить баба Маня, но более-менее мыслящий человек сразу поймает: при галопирующей инфляции — это бред, миф, пустая сказка.

Мы, частные предприниматели, в политику лезть не хотим. В ту политику, которую подразумевают власти. Наша политика — это хлеб и чего-нибудь к хлебу. Мы ничего ни у кого не просим, ни на кого не надеемся. И если у нас станут отбирать последнее, то рано или поздно сама жизнь все-таки приведет нас в политику. Я в этом уверена!

НАДЕЖДА,
частный предприниматель из г.Слуцка.

БЫЦЬ ЦІ НЕ БЫЦЬ?

Гамлетаўскае пытанне стаіць перад намі, беларусамі, — зможам мы і далей жыць на гэтай зямлі ці згінем?

3. Талерантныя пескары

(Працяг. Пачатак у №№ 66,67)

Вы калі-небудзь задумваліся, чаму авечка з усяе сілы пнецца ў свой хлеў, ахоплены полымем? З яго ўсе выбягаюць: каровы, коні, свінні, куры... Адна авечка рвецца туды, куды яе прывучылі заходзіць. Усім жывёлам патрэбен пастух: і каровам, і свінням, і курам. Інакш яны збочаць на пасевы. А авечка будзе шчыпаць затаптаную траўку, дзе яе пакінулі, і нават не падумае перайсці на іншы ўчастак. Калі ж, вяртаючыся з пашы, убачыць новыя дзверы на двор гаспадара, дык спыніцца і доўга раздумвае: ісці ці не? Нават выраз нарадзіўся: "глядзіць, як баран на новыя вароты".

Чаму так? Бо гэтая жывёла, як вобразна кажуць даследчыкі, "без галавы". Яна ў авечкі ёсць, але тая ёю абсалютна не кумекае. Яна лёгка прывыкае да аднаго і таго ж. І таму пнецца ў свой хлеў, ахоплены полымем.

У гэтым вобразе, на мой погляд, усе беды беларусаў. Калі вобразна абагульняць, то яны надта падобныя на авечку. Не на каня, не на карову, а менавіта на авечку.

Паглядзіце, колькі бед абрынулася на наш народ у мінулым стагоддзі. Спачатку апусташальныя хвалі першай сусветнай вайны, потым грамадзянская вайна, голад 30-х гадоў, сталінскія рэпрэсіі, Вялікая Айчынная вайна, камуністычна-брэжнеўскае вынішчэнне нашай мовы, гісторыі і культуры, Чарнобыль, дубінкі па спінах тых, хто перажывае за Беларусь і яе народ.

Бадай што ніводнай нацыі не выпала столькі гора, як нам. А за што? "Такі лёс", — кажуць многія. Няпраўда, мы самі выбралі сабе такі лёс, бо заўжды лезлі ў пекла, нібы авечка ў хлеў, ахоплены полымем.

Узгадаем хоць бы некаторыя старонкі сваёй гісторыі. Бо без ведання мінулага нельга будаваць будучыню.

Пасля рэвалюцыі 1917 года з Расіі вырвалася на волю Фінляндыя, умацавалі сваю незалежнасць Польшча, Літва... Абвясцілі Беларускую Народную Рэспубліку і лепшыя сыны нашай Айчыны. Ды зацюканыя беларусы не падтрымалі іх, а папляліся за бальшавікамі, нібы авечкі, у расійскі хлеў, ахоплены полымем. У Фінляндыі і Польшчы не было голаду 30-х гадоў і сталінскіх рэпрэсій. А вось мы "выбралі іх".

Перабудова, развал СССР. Прыбалты, украінцы будуюць свае дзяржавы, а мы зноў, нібы авечкі, якіх паганяюць дубінкамі, цягнемся ў былое камуністычна-расійскае стойла, дзе страляюць сярод белага дня і тлеє полымя пажару на Каўказе. Усе нашы суседзі бягуць з імперыі, і толькі мы — у яе.

А ў той жа Расіі прасвету да лепшага не відаць. Вядомы амерыканскі аналітык, дырэктар праграмы еўрапейскіх даследаванняў Вашынгтонскага цэнтра стратэгічных прагнозаў Сайман Серфаты зазначае: патрабуецца некалькі дзесяцігоддзяў, пакуль Расія адшукае сваё месца ў Еўропе і свеце, якім бы тое месца ні было. Такой жа думкі прытрымліваюцца і спецыяліст Цэнтра стратэгічных даследаванняў імя Маршала (Германія) Аляксандр Гарын, расійскі даследчык Валерый Астроўскі. Яны лічаць, што ў XXI стагоддзі Расія, магчыма, паступова будзе паварочвацца да Еўропы. Вось такія несуцяшальныя прагнозы.

Але чаму нашы людзі такія? Чаму яны жывуць не сваім, а чужым розумам?

А гэта звычайнае каланіяльнае мысленне. Так думаюць і дзейнічаюць народы ўсіх каланіяльных краін.

У нашага народа "няма... галавы". Інтэлігенцыя лічыцца мозгам нацыі. А яе ў гады расійскай акупацыі і сталінскіх рэпрэсій амаль знішчылі. Зацісканае беларускай інтэлігенцыі пачалося адразу ж, як толькі Беларусь была захоплена Расіяй. Вось якія парады царскім уладам даваў ідэолаг расійскіх русіфікатараў Б.Салаўёў яшчэ ў 1887 годзе: "Ад аднаго павелічэння рускіх праваслаўных цэркваў у Паўночна-Заходнім краі праваслаўе не ўзмацнілася. Праваслаўе не можа праводзіцца ў жыццё мясцовымі святарамі... Святары, дзякі, настаўнікі гімназій ды іншых устаноў павінны быць прызначаны з ураджэнцаў унутраных расійскіх губерняў, чыста рускага паходжання".

Такі курс упарта праводзіўся два стагоддзі. І праводзіцца. Паглядзіце, колькі ў нашых школах, універсітэтах, на адказных, самых высокіх пасадах людзей з "унутраных расійскіх губерняў, чыста рускага паходжання".

Многія пакаленні беларусаў выраслі ва ўмовах расійскай акупацыі, якая цягнецца два стагоддзі. Яны ўжо не заўважаюць яе, успрымаюць яе як нармальны, натуральны стан. Скажы каму, што мы яшчэ не вырваліся з акупацыйных пут, дык многія накінуцца на цябе. Бо яны ўжо звыкліся з гэтым і не заўважаюць. Таму нагадаем, як выглядае сапраўдная акупацыя і каланізацыя.

На акупаванай ці каланіяльнай тэрыторыі знаходзяцца войскі акупантаў, ужываецца іх мова, распаўсюджваецца іх інфармацыя (газеты, тэлепраграмы), кіруюць іхнія начальнікі, якія прызначаюць на ніжэйшыя пасады мясцовых халуёў. А цяпер паглядзім на Беларусь, так бы мовіць, прымераем сказанае на нашу рэчаіснасць. І што мы бачым? Расійскія войскі, ды яшчэ ў вялікай колькасці, у Беларусі былі раскватараваны дзесяткі гадоў. Ды і зараз іх хапае. Мова зносін у нас руская. У інфармацыйнай прасторы ўладараць расійскія тэлеканалы. Вядучыя пасты ў краіне займаюць рускія. Словам, усе прыкметы каланізацыі.

Яны стагоддзямі ўбіваюць у галовы беларусаў міфы старэйшага брата: "Без Расіі мы не пражывём; у нас адзіная гісторыя і адзіны лёс; галоўнае, каб не было вайны..." А міфы — мацнейшы наркотык, так званы "ўзвышаючы падман". Перад імі нават Гітлер не ўстаяў. Ён паверыў міфам сваіх ваенных: рускія не гатовы да вайны. Але ўжо ў самым пачатку яе на нарадзе са сваімі генераламі ў Барысаве злосна кінуў ім: "Ах, каб я ведаў, што яны так падрыхтаваны, ні за што не пачынаў бы вайну". Што возьмеш з простых людзей, якія так любяць салодкі падман.

Нас пастаянна выдае наша каланіяльнае мысленне, выхаванне на расійскіх міфах. Яно было ў Турцыі, Партугаліі, пакуль там не з'явіліся нацыянальныя лідэры і не адкрылі вочы суайчыннікам. Толькі пасля гэтага іх народы выйшлі на дарогу нацыянальнага адраджэння.

Бяда Беларусі ў тым, што ў вельмі адказны перыяд, калі рухнула Расійская імперыя, у нас на верхніх паверхах улады не аказалася ніводнага празарлівага лідэра. На адказных пасадах сядзелі бяздумныя халуі. Таму наш народ пакуль не жыве. Ён толькі ўдзельнічае ў эксперыментах.

Трэба да канца дабіць родную мову? Калі ласка. Прадаць дзяцей у рабства імперыі? Згодны. Яны галасуюць за забарону сваёй мовы, за далучэнне краіны да Расіі, за знявагу нацыянальных сімвалаў... Іх абсалютна не турбуюць шалёныя цэны, нізкія заробкі і пенсіі. Яны гатовы спакойна глядзець, як паміраюць ад адсутнасці добрых лекаў і харчавання бацькі і дзеці...

Вось такі ёсць народ на зямлі. Адзіны.

Пра яго ўжо пайшлі анекдоты.

— Круціцца, ёрзае на табурэтцы беларус, месца сабе не знаходзіць.

— Што з табой? — пытае сусед.

— Ды цвік у табурэтцы моцна колецца.

— То вырві яго альбо сядай на другі табурэт.

— А навошта? Можа, так і трэба.

Будучае нашай нацыі з'явіцца тады, калі мы пачнём думаць уласнай галавой і пазбавімся паганятых з пугай. Да гэтага падштурхоўваў нас наш вялікі празарліўца Янка Купала. У 1919 годзе ён напісаў артыкул "Больш самачыннасці", які я і хачу пераказаць у скарочаным выглядзе: *"Трэба прызнацца, што якое б ліха навакол нас і з намі не рабілася, якіх бы мы ні перажывалі нягод і крыўд — мы гэта як бы не бачым, а калі і бачым, то ліха церпім ды чакаем, што вось нехта прыйдзе і гэта нашае ліха забярэ з сабою...*

Быў маскоўскі цар, былі ў нас пасланыя імі ўсялякія чыны: земскі, вураднік, стражнік. Усе гэтыя чыны намі "апекаваліся", а мы шчыра служылі ім, як нявольнікі, ды, уздыхаючы і заціскаючы кулакі, стараліся сябе ўгаварыць, што так і трэба, каб хтось панаваў, а часта казалі, што гэта так Бог даў. А самі ж і пальцам не кіўнулі, каб гэтым сваім апекунам паказаць іх належнае месца...

Прыйшлі немцы, бальшавікі ўцяклі, мы засталіся. Немец гаспадарыў, як сам хацеў, над намі, над нашым дабром... А мы што рабілі? Мы сядзелі чакалі, злажыўшы рукі, чакалі нейкага цуду, які забярэ нашае ліха. І дачакаліся. Прыйшлі зноў бальшавікі, навялі свае парадкі...

Самы найлепшы прыяцель, самы найлепшы збаўца наш ад нашага ліхалецця — гэта мы самі. І калі не хочам загінуць, калі не хочам быць вечнымі рабамі, — павінны пакінуць мы благую прывычку думаць, што нехта прыйдзе і выратуе нас з нашай бяды, з нашай няволі. Гэта ж не можа быць, каб нехта быў лепшым прыхільнікам да нас, як мы самі для сябе.

Не, браты, такім ладам мы далёка не заедзем. Час правяць нам свае сілы ў будаванні новага жыцця для сваёй Бацькаўшчыны".

Уражанне такое, нібы артыкул Купалы напісаны сёння. Бо нічога з таго часу не змянілася. Усе чакаюць, што нехта палепшыць нам жыццё.

Самая цяжкая прафесія — быць чалавекам. А быць ім — значыць быць змагаром за лепшую долю. Падобна, што беларусы яшчэ не асвоілі самую важную прафесію на зямлі.

Выдатны пісьменнік і філосаф Джэк Лондан неяк сказаў: "Чалавек вельмі малы, але які вялікі ён!" Пра нас, відаць, толькі першая частка сказа. Успамінаецца мітынг і шэсце, якія праводзіліся ў Заводскім раёне. Дакладней, не столькі гэтае мерапрыемства, колькі твары ў вокнах. Іх было вельмі многа. І ў мікрараёне Трактарнага завода, і ў Серабранцы.

Чакалася, што менавіта яны, рабочыя, выйдуць на дэманстрацыю і мітынг. Бо яны праводзіліся ў іх інтарэсах, як пратэст супраць нізкай зарплаты і цяжкага становішча рабочага чалавека. І праводзіліся не ў цэнтры горада, а ў мікрараёнах, дзе жывуць працаўнікі. Але яны не выйшлі. Відаць, спужаліся і толькі баязліва пазіралі з вокнаў, чым засведчылі: "Як многа ў нас звычайнасці, як мала ў нас адчайнасці".

Зарплаты не хапае на хлеб, малако, не гаворачы ўжо пра яблыкі і апельсіны, якія так патрэбны людзям, "пасыпаным" Чарнобыльскім попелам, а яны нават баяцца сказаць пра гэта. Такія людзі нагадваюць "премудрого пескаря", які ўсё жыццё баяўся і дрыжаў, каб яго не зачапіў сваім вострым зубам шчупак. Ён так і прасядзеў усё сваё жыццё ў нары, нічога добрага не пабачыў. Адзінае, чаго ён заслужыў, дык пахвалы шчупака, які ці то смеючыся, ці то імкнучыся выманіць яго з нары, каб з'есці, казаў, які добры і разумны гэты "премудрый пескарь". Ну, рыхтык як цяпер, масквічы і нашы ўлады называюць беларусаў талерантнымі і разумнікамі. Словам, талерантныя пескары.

Нашы "талерантныя пескары" з Вярхоўнага Савета і Канстытуцыйнага суда надта верылі дэсанту з Масквы напярэдадні імпічменту Лукашэнку, што Чарнамырдзін, Строеў і Селязнёў дапамогуць вырашыць беларускую праблему. І дачакаліся. "Талерантныя пескары" з партый і рухаў наіўна чакаюць, што Масква неяк паўплывае на Беларусь у лепшы бок. Дачакаюцца, што запішчаць яшчэ. "Пескары" з прафсаюзаў усё яшчэ спадзяюцца дамовіцца з уладамі і ніяк не могуць дакумекаць, што ім варта выходзіць на сумесныя акцыі з апазіцыяй. Талерантны Шарэцкі, якому ўлада сама ўпала ў рукі, у ліпені 1999 года збег ад яе і хаваецца ў Літве. Здзіўляюць некаторыя дзеячы мастацтва і навукі. Варта было паказаць ім "маркоўку", як яны навыперадкі пабеглі ў кішэнную палатку. Ці хоць разумеюць тыя ж Елізар'еў, Фінберг, Янкоўскі, Вайтовіч, у што яны "вляпались"?

Іван МАКАЛОВІЧ.
(Працяг будзе.)

Ці знойдзецца яшчэ краіна, у якой вось так бы радаваліся з нагоды страты яе волі і незалежнасці?

ГОРЬКИЙ ЮМОР...

При пустом холодильнике легко поститься...

Здравствуйте, уважаемая редакция "Народной воли!"

Читая Вашу газету и другие независимые издания, я замечаю: много критики в адрес Лукашенко. А вот мне, если позволите, хочется поблагодарить его за помощь мне и другим людям.

Как известно, сейчас идет великий предпасхальный пост. Время покаяния, очищения, прощения. Главной формой поста является отказ от употребления многих видов пищи, молитва, милостыня. Разумеется, человек к этому подходит в силу своего сознания, веры и Божьей ласки. Постепенно приобщаясь к молитве, к храму и к законам Божьим. А стало быть, и воздержание от мясной пищи, хотя бы по пятницам и средам, повторяюсь, все зависит от веры. А человек по натуре слабый, особенно когда касается табака, алкоголя, вкусной еды, развлечений и всего того, что не пускает прийти в храм. А человеку слабой веры не очень легко отказаться от привычного, да еще сильное искушение — это холодильник с колбасой, сосисками, мясом и т.д. и т.п.

Вот тут-то и чувствуется забота, помощь Александра Григорьевича людям, начинающим жить по законам Божьим, и придерживающихся правил Великого поста. Помощь от искушения холодильника путем его опустошения. Чем не помощь, теперь человеку легко поститься — нет искушения. Открыл холодильник и закрыл, даже слюне нет отчего собраться. Разве не забота? Вот где истинный христианин! Долгих лет господину Лукашенко!

А скольким он помог людям, которые самостоятельно пытались лечиться голоданием по Полю Брегту, и опять из-за холодильника прерывали голодание, вскрывая его и поедая недельные запасы.

Теперь с нашими зарплатами можно легко воздерживаться от мясного во время поста, лечиться голоданием по Полю Брегту, хочешь неделю, месяц, сорок дней, а хочешь и весь год.

Спасибо Александру Григорьевичу!

С уважением —
Женя В.,
житель Гродно.

НАВІНЫ

Ляціце па маршруце Гомель—Мінск—Гродна

10 красавіка ў продаж паступілі білеты на першы авіярэйс па маршруце Гомель—Мінск—Гродна, які 16 красавіка ажыццявіць самалёт АН-24 дзяржпрадпрыемства "Аэрапорт Гомельавія". Такім чынам, з 16 красавіка аднавяцца рэгулярныя паветраныя зносіны памж трыма абласнымі цэнтрамі Беларусі.

Палёты па гэтым маршруце аднавяцца з адтэрміноўкай на тры дні ад першапачаткова запланаванай даты. Затрымка з распаўсюджваннем білетаў была выклікана доўгім зацвярджэннем тарыфаў на пералёт. Аднак кіраўніцтва прадпрыемства мяркуе, што за астатнія дні яму ўдасца прыцягнуць пасажыраў на гэты рэйс, як і на наступныя, якія будуць ажыццяўляцца тройчы ў тыдзень — па панядзелках, серадах і пятніцах. Уключаючы 45-хвілінную стаянку ў аэрапорце "Мінск-1", падарожжа з Гомеля ў Гродна зойме 2 гадзіны 10 хвілін.

Кошт білета ад Гомеля да Мінска складае 10 тысяч рублёў, да Гродна — 19,5 тысячы. У той жа час сабекошт палёту як мінімум у тры разы вышэй, і пытанне, якім чынам гэтая розніца будзе кампенсавацца гомельскай авіякампаніі, пакуль застаецца адкрытым.

Ірына ШАНЦАВА.

А.Лукашенко поменял место жительства?

Судья Фрунзенского района г.Минска П.Колубако отказал Анатолию Лебедько в возбуждении дела в отношении Александра Лукашенко по статье *Клевета и о защите чести и достоинства*. Мотивация решения — гр.Лукашенко не проживает на территории Фрунзенского района г.Минска. Хотя в декабре прошлого года судья того же Фрунзенского района Л.Шапошникова по аналогичному иску А.Лебедько к А.Лукашенко приняла документы к рассмотрению, чем фактически признала то, что ответчик проживает во Фрунзенском районе г.Минска.

По мнению самого А.Лебедько, "А.Лукашенко либо недавно отметил очередное новоселье, либо судам дана жесткая установка не привлекать экс-президента к ответственности за клевету". Лидер ОГП, однако, намерен обратиться с иском во все суды, на территории которых находятся многочисленные резиденции А.Лукашенко.

"Я все равно заставлю А.Лукашенко отвечать за клевету. В этом вопросе для меня не существует срока давности", — заявляет А.Лебедько.

Пресс-служба ОГП.

Банкнота ў 10 тысяч рублёў

16 красавіка Нацыянальны банк Беларусі ўводзіць у абарачэнне банкноту вартасцю 10 тысяч рублёў узору 2000 года.

Згодна з афіцыйным паведамленнем галоўнага банка краіны, купюра вартасцю 10 тысяч рублёў мае памер 150х74 міліметра і выраблена на спецыяльнай высакаякаснай таніраванай паперы светла-ружовага колеру з ахоўнымі валокнамі, лакальным вадзяным знакам і ахоўнай ніткай.

Сюжэт асноўнага відарыса вонкавага боку банкноты — панарама Віцебска, мост праз раку Дзвіну. Пераважаючыя колеры: цёмна-чырвоны і цёмна-сіні. Пры гэтым гравюра асноўнага відарыса, абазначэнне наміналу білета, гільшырныя палосы, метка для людзей з аслабленым зрокам і надпісы вонкавага боку маюць павялічаную таўшчыню маляўнічага слоя, дзякуючы чаму добра ўспрымаюцца навобмацак. Злева ад асноўнага відарыса — стылізаваны нацыянальны арнамент, выкананы фарбай блакітнага колеру.

Справа ад асноўнага відарыса, у гільшырнай паласе, размешчаны прыхаваны відарыс літар "РБ", які праяўляецца пры разглядзе білета пад вуглом зроку. З правага боку ад асноўнага відарыса ўверсе размешчаны відарыс фрагмента нацыянальнага арнаменту, які сумяшчаецца на праспект.

У сістэме аховы білета вартасцю 10 тысяч рублёў выкарыстана металізаваная серабрыстая фарба. Ёю надрукаваны: воблакі над гравюрай асноўнага відарыса, элементы арнаменту злева ад асноўнага відарыса і падложка авальнай формы пад лічбавае абазначэнне наміналу "10000" справа ўверсе ад гравюры асноўнага адлюстравання.

Аляксей АРЭШКА.

Школьнікі разграмілі могілкі

Дзікі ва сваёй бессэнсоўнасці і бесчалавечнасці выпадак адбыўся ў вёсцы Ужляціна Шумілінскага раёна Віцебскай вобласці. 9 красавіка двое школьнікаў адзінаццаці і трынаццаці гадоў вывернулі на магілах металічныя крыжы і прайшліся з імі па вясковых могілках. Крыжамі яны разбілі 3 помнікі, 31 надмагільны помнік, сарвалі 30 надмагільных медальёнаў.

Паколькі абодва падлеткі не дасягнулі чатырнаццацігадовага ўзросту, кампенсацыя аднавяскоўцам маральных і матэрыяльных выдаткаў кладзецца на іх бацькоў. Нават у раённым аддзяленні міліцыі заклапочаны далейшым развіццём падзей, паколькі акт вандалізму падлеткі ўчынілі напярэдадні хрысціянскага свята Вялікдзень, за якім ідзе Радаўніца — дзень памінання нябожчыкаў. Многія сваякі, пахаваных на гэтых могілках аднавяскоўцаў, яшчэ нават не ведаюць ад тым, што здарылася, паколькі прыедуць толькі на вышэйзгаданыя святы. Як у будучым у юных варвараў складуцца адносіны з аднавяскоўцамі, можна толькі меркаваць.

Ірына МАРЫСКІНА.

ВЗГЛЯД

Не надо лукавить

Русские, украинцы и белорусы — разные народы

Известный белорусский ученый Николай Сташкевич, который, кстати, исполняет обязанности директора Института истории Национальной академии наук, в своей статье "Формирование белорусской государственности", напечатанной в журнале "Белорусская думка", №1 за 2001 год, попробовал фрагментарно рассмотреть с марксистских позиций, усиленных великорусской идеологией, тысячелетнюю историю Беларуси.

Все историки за точку отсчета образования Киевской Руси берут 882 год, когда новгородский князь Олег завоевал Киев. Но уже после гибели киевского князя Святослава в 972 году, по словам известного историка Новосельцева, практически произошел раздел "государства" между сыновьями Святослава, а в 1097 году оно юридически распалось. Так можно ли называть Киевскую Русь государством, если оно так быстро сошло с исторических рельсов?

Мы должны понимать: Киевская Русь — это не Московия, это не Россия. То был очень небольшой по историческим меркам период, когда некоторые земли нынешней Беларуси находились в составе Киевской Руси, и не более...

Подавляющее большинство русских историков в настоящее время согласны с тем, что по отношению к Речи Посполитой, куда входили все белорусские земли, со стороны Пруссии, Австро-Венгрии и России был совершен агрессивный акт. Попутно отметим, что в Речи Посполитой существовали относительно демократические традиции, которых напрочь не было в России. Там был крепостной строй, имевший все черты рабства, перенесенные затем на белорусских крестьян.

Профессиональным историкам должно быть хорошо известно, что когда на белорусские земли стали приезжать русские, то они увидели совсем другой народ, вовсе не идентичный им во всем. Даже если брать религию, то в Беларуси только около 10% населения имели православное вероисповедание, большинство же были униатами или католиками. Да что говорить о далеких временах! Сейчас, когда я начинаю разговаривать со своими русскими друзьями на белорусском языке, они с трудом понимают меня...

Утверждения о том, что, оказавшись в составе России, белорусы возродили свои национальные традиции, культуру, литературный язык, прямо скажем, беспочвенны. Ведь даже название нашей страны было заменено на "Северо-Западный край". Разве Вам неизвестно, что только в самом конце XIX века начали появляться белорусские книги, а газета "Наша Ніва" стала выходить в 1906 году? И разве секрет, что царское правительство с какой-то дьявольской силой душило все белорусское?

В одном согласен с Вами: советская власть действительно дала определенный толчок для развития всего белорусского — на время.

Немного о том, уважаемый Николай Стефанович, что Вы пытаетесь убедить читателей: мол, оказавшись в Союзе с Россией, Беларусь останется независимым государством. Вы слышали белорусскую пословицу "Тэтаму і Ганна пастухова не верыць"? И в России никто не верит в то, что Беларусь будет независимым государством. Все хорошо понимают — от простых людей до политиков высокого ранга — что идет своеобразная игра в так называемый Союз. Крепко привязав к себе Беларусь, Россия всеми силами будет добиваться, чтобы в ее лоно вошла и Украина с ее огромным промышленным и сельскохозяйственным потенциалом. Как здесь не вспомнить слова царского генерала и деятеля белого движения Деникина: "Без Украины Россия никогда не будет великой державой". Вот здесь и кроется корень игры в Союз...

Нет сомнения, что в союзном государстве жизнь белорусов не улучшится. Пройдет несколько десятков лет, и им скажут приблизительно так: "Вы, друзья, по всем параметрам — русские. Так что и живите, как все у нас живут...".

А перспектива такого единения очерчена статьей в российской газете, где говорится: "Россия — страна с отсталой промышленностью, безнадежного сельского хозяйства, криминального беспредела и самой отвратительной коррупции. Страна гибнущей науки и отравленной природы. Словославие великой России — политический "хит"...

Так что не надо лукавить, подводя "научную" базу под губительное для белорусского народа "единение".

Александр ПЕТРУННИКОВ.

Народная Воля
12 КРАСАВІКА 2001 г.

ПОВИСЛЕ

Белорусско-польские заметки

Семен Букчин

(Продолжение. Начало в № 67.)

В Польше не уверены насчет существования белорусского языка. Я, разумеется, не имею в виду людей профессионально осведомленных — университетских специалистов и т.д. Здесь полный порядок, и, можно сказать, что с белорусистикой в Польше очень даже неплохо дело обстоит. И книги выходят, и аспиранты трудятся на кафедрах соответствующих, и диссертации защищаются...

Но я не подразумеваю под сомневающимися и только тех, кого в Польше презрительно именуют как "ciemnogrod" (по-нашему — темнота, тупость, отсталость). Люди вполне образованные осведомлялись у меня, есть ли такой язык — белорусский и говорят ли на нем в Беларуси. Скажем, владелец небольшого полиграфического предприятия, где верстаться моя книга "Белорусская трагедия", вполне образованный компьютерщик задал мне именно такой вопрос. Ну и народ попроще интересовался. В больнице, к примеру, сосед по палате, мастер по ремонту сельскохозяйственной техники... Просили даже поговорить по-белорусски, чтобы услышать, как она звучит, белорусская речь.

За этими вопросами, конечно же, не стояло знание нынешней национально-языковой ситуации у нас, осведомленность об уничижительном отношении власти к белорусскому языку. Люди спрашивали не потому, что знали, как плохо у нас в этой сфере, а потому, что в принципе ничего не знали о белорусском языке, сомневались в его существовании, поскольку были уверены (из личного, может быть, опыта), что, кроме русского, другого языка у нас и нет в ходу.

Для меня это лишнее подтверждение нашей национальной непроявленности в глазах ближайших соседей. Ну не спросит никогда поляк, есть ли такой язык как чешский... Потому что он его слышит, когда пересекает чешскую границу, и даже знает какие-то выражения, хотя и посмеивается над самим звучанием чешской речи. И в существовании украинского языка поляк уверен. Но тут еще действуют особые — исторические — счета... И об этом разговор особый.

Зато белорусы — это очевидная языковая загадка для поляка. А когда он узнает, что и президент Беларуси предпочитает русский язык и презрительно отзывается о белорусском, то это у него и вовсе в голове не укладывается. И он вообще отказывается что-либо понимать... Ибо для поляка терпеть ТАКОЕ — это нечто невозможное, а потому непредставимое.

***

Так вот насчет польского мата... Я не без смущения приступаю к этой теме... Но дело-то жизненное. А потому вполне достойное обсуждения. Наш ныне пребывающий в добровольном изгнании лидер Консервативно-Христианской партии — БНФ Зенон Позняк еще в либерально-перестроечные годы пытался внушить соотечественникам, что матерщину на Беларусь принесли русские, что именно они научили это дитя природы, простодушного и наивного, чистого белоруса всяким непристойным выражениям. Как, между прочим, и пьянству.

Специалисты по этимологии русского языка утверждают, что мат в Россию занесли татары во времена Орды. Тюркологи могут подтвердить известное происхождение ряда русских ругательств. Я не знаю, кого обвиняют (если обвиняют) поляки в занесении в их страну "крепкого слова". Но должен сказать на основании, так сказать, личного бытового опыта, с одной стороны, а с другой — внимательного изучения "Словаря польских ругательств и вульгаризмов" Мачея Грохвского ("Slownik polskich przeklenstw i wulgarizmow", Wydawnictwo naukowe PWN, Warszawa, 1995), что польский мат достаточно однообразен. Чаще всего он имеет одну функцию — пригвоздить соперника, неугодную личность. Все эти "kurwy", "dupy", "gnojku", "gowniaze" при определенной и даже замечательной вариативности предназначены для прямого свала противника. Это как удар мечом на рыцарском турнире. Может быть, такая "прямая традиция" связана с польским шляхетством? Не знаю...

В польской матерщине нет загадки, нет, как сказал бы поэт, мечты, той непознанности, которая волнует самые потаенные глубины русской души. В армии, наблюдая мои неудачные действия с тряпкой во время мытья пола в казарме, старшина философски изрек: *"Ну что ты тянешься, как беременная вошь по мокрой п....?"* Я остолбенел, ибо это было как удар грома. Беременная вошь — потрясающий образ! И почему она тянется по п... да еще и мокрой? Тот, кто ответит на этот вопрос, прикоснется к загадке "таинственной русской души". Но ведь никогда и никому не разгадать! Есть у русского народа свои тайны... Тот же старшина однажды всердцах бросил мне: *"Чтоб тебе х.. расковали на пятнадцать царских медных пятаков!"*

Почему этот не самый бесполезный орган должны были расковать на царские медные пятаки? И почему именно на пятнадцать, а не на десять или двадцать?

Ответ на этот вопрос невозможен. Но он побуждает к раздумьям...

(Продолжение следует.)

Варшава.

Фото IREX/ProMedia.

ДАЙДЖЕСТ

Бородин еще посидит

Обвинительная палата Женевы не смогла принять решение по ходатайству защиты об освобождении Павла Бородина под залог. Судья Мартина Хайер заявила, что решение будет объявлено в четверг в 11 утра по московскому времени.

Слушание проходило без обвиняемого, так как у него обнаружились проблемы с сердцем (он был госпитализирован в женевской тюрьме Шан Далон). Сразу после заседания адвокаты Бородина и представители Генерального консульства России в Женеве отправились в госпиталь с целью оглашения госсекретарю Союза России и Беларуси решения палаты. По словам адвокатов Бородина, они были уверены, что их клиента освободят из-под стражи, хотя в Швейцарии бывшего кремлевского завхоза обвинили в отмывании денег и в принадлежности к преступным организациям.

Поезд с радиоактивными отходами

Поезд с радиоактивными отходами с германских атомных станций пересек во вторник вечером границу Франции. В пяти контейнерах находится отработанное урановое топливо, извлеченное из реакторов трех АЭС, расположенных в Баварии, в Баден-Вюртемберге и в Гессене. После переработки на французских предприятиях отходы будут возвращены на хранение в Германию.

Под Киевом нашли отрубленные человеческие головы

Останки четырех человек обнаружены во вторник в окрестностях села Дубровка Киевской области. Первую страшную находку — отрубленную человеческую голову — нашел в поле местный житель. Прибывшие на место происшествия оперативники обследовали близлежащую территорию недавно вспаханного поля и обнаружили еще три отрубленные человеческие головы и четыре руки, которые были зарыты в земле на небольшую глубину.

Джордж Буш поручил гомосексуалисту бороться со СПИДом

Президент США Джордж Буш включил в администрацию США человека, открыто заявляющего о своей гомосексуальной ориентации. Гомосексуалист Скотт Эверетц стал главой национального комитета по борьбе со СПИДом. Комментируя это решение президента, представитель Белого дома Ари Флейшер заявил, что Буш выбирает людей, лучше всего выполняющих свои обязанности, вне зависимости от их сексуальной ориентации.

Lenta.ru.

В Нидерландах принят закон, разрешающий эвтаназию

Большинство депутатов верхней палаты Генеральных штатов (парламента) Нидерландов проголосовало за закон, при определенных условиях разрешающий эвтаназию. Нидерланды стали первой страной, где законодательно закреплено право врача умерщвлять безнадежно больных пациентов с их согласия.

Новый закон устанавливает очень жесткие рамки для применения эвтаназии на практике. Пациент должен быть неизлечимо болен, причем его болезнь должна сопровождаться "невыносимыми страданиями", а умерщвление должно производиться с его согласия, данного в состоянии ясного ума.

Агентство ЭФЭ.

Президент Башкирии предлагает регионам купить акции НТВ

Президент Башкирии Муртаза Рахимов предложил регионам, в которых вещает НТВ, выкупить блокирующий пакет акций телекомпании. По его мнению, "национальный канал должен принадлежать России", и обеспечивать его независимость должны не западные инвесторы, а российские бизнесмены. Тогда, по мысли Рахимова, на этом канале будет показано мнение всей России, а не ее властей.

Перестрелка в Питере: есть жертвы

Один человек погиб и один получил ранение в результате перестрелки в Приморском районе Санкт-Петербурга.

Утром жильцы дома номер 74 по улице Новоалександровской сообщили в милицию о том, что на улице слышны выстрелы. На место выехали сотрудники правоохранительных органов. При осмотре местности они обнаружили тело мужчины, убитого выстрелом в грудь. Второй мужчина, также с огнестрельным ранением груди, был госпитализирован.

Шарль Азнавур завершил свое прощальное турне

Концертом в городе Дивонне знаменитый французский шансонье Шарль Азнавур завершил свое изнурительное прощальное турне по 13 городам Франции. Завершая концерт, 75-летний артист, преобразивший традиционный французский шансон, поблагодарил зрителей за поддержку на протяжении всех этих 60 лет.

В Калифорнии перевернулся автобус: пострадали 35 человек

Туристический автобус, направлявшийся к одному из казино, перевернулся на горной дороге возле города Сан-Диего, Калифорния. По сообщению полиции, все 35 пассажиров автобуса пострадали, 13 из них — серьезно, 15 получили "ранения средней тяжести". Водитель автобуса заявил, что он ехал со скоростью значительно меньшей, чем установленное ограничение, но был вынужден сделать резкий вираж, чтобы избежать столкновения, и не справился с управлением.

Lenta.ru.

ДУХОЎНЫ СКАРБ

Энцыклапедыя "Народнай волі", выпуск №9

КАЗІМІР АЛЬХІМОВІЧ

Мастака зачаравала мінуўшчына

Сапраўдная свядомасць (у тым ліку і сусветная) да Альхімовіча прыйшла дзякуючы карціне "Пахаванне Гедзіміна", завершанай у 1883 годзе. На шырокі глядацкі суд яна была вынесена крыху пазней. Але які поспех! Твор з 1887-га па 1888 год экспанаваўся на выставах у Варшаве, Пецярбургу, Львове, Сан-Францыска... І нязменныя высокія ўзнагароды. І захапляльныя водгукі крытыкі. І шмат наведвальнікаў, што на выставах запыняліся менавіта ля гэтага палатна. І заканамернае жаданне многіх даведацца, а хто ж такі Гедзімін, адкуль да яго падобная ўвага мастака.

Карціна напісана так, што веліч і смутак паяднаны. Веліч ад усведамлення, якія людзі калісь жылі на беларускай зямлі. Смутак ад незваротнасці страты. Такі настрой перажываў і сам мастак. Пра гэта здагадваешся, асэнсоўваючы сюжэт. Фарбы ствараюць адпаведны настрой. А яшчэ — удалая кампазіцыйная прадуманасць твора. З самога гушчару, з нетраў яго, дзе, здавалася б, дагэтуль ніколі не ступала нага чалавека, выходзяць воіны. У смутку і жалобе нясуць яны на руках цела князя, якому не толькі служылі верай і праўдай, але і любілі яго. За мужнасць і справядлівасць, за адданасць роднай зямлі. Поруч — гэткі ж самотлівы народ, той народ, якому Гедзімін аддаў сваё жыццё.

Людзі ў белых апратках. Журботнасць малюнка яшчэ больш узмацняецца прысутнасцю магутных дубоў і елак, што моўчкі застылі быццам вартавыя, аддаючы апошнюю пашану чалавеку і воіну. Цяжкія хмары, якія завалаклі неба, таксама нагадваюць адбылася трагедыя. І ў гэты момант, калі ўжо нічога немагчыма паправіць, застаецца адзінае і найбольш прымальнае — яшчэ дасней аб'яднацца, каб супольна выступаць супраць ворагаў.

Двойчы звяртаўся Альхімовіч да вобліку яшчэ аднаго слаўнага князя, чыё імя так шмат значыць у гісторыі нашай дзяржавы — Кейстута. Пісаў свае творы ў той час, калі ў афіцыйнай гістарычнай навуцы яшчэ ніхто ўсур'ёз не ставіўся да грамадскіх, дзяржаўных спраў і ратных подзвігаў гэтага князя. У цэнтры ўвагі мастакоў пастаянна знаходзіліся іншыя гістарычныя асобы, тыя, хто таптаў беларускую зямлю, заваёўваў яе, а ў палітычных стасунках арыентаваўся толькі на Маскву ці Варшаву. Але не яны вабілі Альхімовіча. Яму хацелася ўвасабляць на палатне лепшых сыноў Бацькаўшчыны.

Асабліва важна, што Альхімовіч быў далёкі ад думкі, паводле якой наступнікі пасапраўднаму, з вялікай павагай паставяцца да пэўнага нацыянальнага дзеяча толькі тады, калі ён будзе паказаны падчас нейкай рашаючай сваёй справы. Разумеў, наколькі важна адчуць душэўны стан таго, каго ўвасабляеш. Таму і выбраў для раскрыцця вобліку Кейстута сюжэт не гераічны, а побытавы. Князь пасля цяжкага бою прылёг адпачыць ды так стаміўся, што адразу, як забіты, заснуў. Ніхто не хоча патрывожыць яго сон, хоць цяпер зусім не да адпачынку. І гэта відаць па вачах воя, які непадалёку выглядае з кустоў. Ён не проста ахоўвае Кейстута. Ён ведае — вораг побач. Позірк юнака засяроджаны, да таго строгі, што калі ўзнікне хоць маленькая небяспека, ён, не задумваючыся, не чакаючы падтрымкі, кінецца ў бой.

Калі на карціне "Адпачынак Кейстута" паказаны сам князь, дык на другой — "Вітаўт на магіле Кейстута" — у роздуме застыў той, каму прадаўжаць справу па аб'яднанні беларускіх зямель. Вітаўт злез з каня, стаіць нерухома. Пра што думаецца яму ў гэты момант, можна толькі здагадвацца. Магчыма, непакоюць думкі, што нішто не вечна на зямлі і калі-небудзь яму самому давядзецца назаўсёды адысці ў нябыт. Асабліва, калі ўлічыць, што так часта даводзіцца выступаць супраць ворагаў і столькі небяспекі падсцерагае на кожным кроку. Хоць, хутчэй, Вітаўт дае маўклівую клятву вернасці справе, якой служыў Кейстут. І разам з тым — зноў жа — моўчкі — клянецца помсціць ворагам...

...Нарадзіўся Казімір Альхімовіч 20 снежня 1840 года ў вёсцы Дэмбрава Лідскага павета (цяпер Шчучынскі раён) у сям'і небагатага шляхціца. Маленства прайшло на ўлонні маляўнічай прыроды, якую хлопчык палюбіў з ранніх гадоў. Непадалёку працякала рэчка Спушанка. Вясной яна разлівалася, утвараючы мора.

Бацька Дамінік Альхімовіч не надта прытрымліваўся строгіх правіл у выхаванні дзяцей, і Казік меў шмат вольнага часу. Хоць сям'я была і не вельмі багатая, грошай на навучанне не шкадаваў (дарэчы, брат Казіміра Альхімовіча Гінцынт таксама стаў мастаком). Калі Казік падрос, яго адправілі ў Віленскую гімназію. Відаць, на гэты час прыпадае і яго захапленне маляваннем, хоць хутчэй, першыя малюнкі выканаў яшчэ ў дзяцінстве. Аднак вучоба ў гімназіі не магла не стаць тым штуршком, які прымусіў далей развіваць свой творчы дар.

Тады ў Вільні вялікай папулярнасцю карысталася ў тамашняй інтэлігенцыі творчасць мастака Канута Русецкага. Не ў апошнюю чаргу таму, што ён вялікую ўвагу надаваў паказу жыцця простага чалавека. Праўда, прытрымліваўся "італьянскай манеры", але пэўная ідэалізацыя не адмаўляла жадання Русецкага праўдзіва адлюстраваць воблікі тых, хто, магчыма, быў у нечым і абдзелены ў жыцці, ды меў багатую і шчодрую душу. Шырокі рэзананс мелі такія яго карціны, як "Жняя", "Літоўка з вербамі", "Дзяўчынка, якая спіць".

Шкада, але больш-менш пэўных звестак аб тагачасным і пазнейшым жыцці Альхімовіча не захавалася. Вядома толькі, што пасля заканчэння гімназіі ён некаторы час працаваў аканомам ў адным з мінскіх пад Кіевам. Няма сумнення, што гады вучобы ў гімназіі не прайшлі бясследна, далучылі да перадавых ідэй свайго часу. Ужо тады Альхімовіч марыў аб сацыяльнай справядлівасці, нацыянальным разняволенні народа. Таму, калі пачалося паўстанне 1863 года, апынуўся ў шэрагу яго ўдзельнікаў. Пасля разгрому выступлення супраць царызму быў арыштаваны. Аднак, у параўнанні з іншымі ўдзельнікамі, быў пакараны, можа сказаць, мякка — выслалі на Урал, у Верхатур'е. Цяжка меркаваць, наколькі ён з'яўляўся актыўным барацьбітом з царызмам. Бадай, захоўваў вялікую канспірацыю, таму нейкіх асаблівых, кампраметуючых яго ўлік, улады і не знайшлі. Маглі дапамагчы і хадайніцтвы ўплывовых асоб.

У ссылцы Альхімовіч знаходзіўся да 1869 года, вызвалілі яго па амністыі. Збіраўся падацца на радзіму, у тагачасны Лідскі павет, ці пасяліцца ў якім-небудзь іншым месцы Гродзеншчыны, але ўлады забаранілі. Перабраўся ў Варшаву. На гэты час канчаткова зразумеў, што яго прызванне ў маляванні. Адначасова пераканаўся, што нестае спецыяльнай прафесійнай падрыхтоўкі. Таму ў 1871 годзе паступіў у рысавальную школу, якую ўзначальваў Войцех Герсан. Выпускнік Пецярбургскай Акадэміі мастацтва, ён стварыў прыватную навучальную ўстанову.

Ёсць меркаванні, што Альхімовіч з'яўляўся любімым вучнем Герсана. А паколькі Акадэмія мастацтваў мела шэфства над гэтай школай, дык дзейнасць яе выхаванцаў заўсёды знаходзілася ў полі зроку мастацкіх славутасцяў. Тым больш, што Герсан рэгулярна прадстаўляў у акадэмію лепшыя работы сваіх вучняў. У тым ліку і Альхімовіча, які быў двойчы ўзнагароджаны сярэбраным медалём. Такую высокую ацэнку атрымалі яго работы "Смерць у выгнанні" і "Пахаванне на Урале".

Няцяжка здагадацца, што ў аснову твораў пакладзены асабістыя ўражанні аўтара ад знаходжання ў ссылцы. З гэтага моманту ў Альхімовіча і акрэслілася схільнасць адлюстроўваць драматычныя моманты ў жыцці. Аднак, хоць першыя творы і знайшлі належную ацэнку, станаўленне творчай індывідуальнасці Альхімовіча адбывалася паступова. Гэта разумеў і ён сам, таму ў тым жа 1873 годзе, калі была завершана вучоба ў школе, паступіў у Мюнхенскую акадэмію мастацтваў, дзе займаўся два гады. Заняткі праходзілі пад кіраўніцтвам прафесара Вагнера, які клапаціўся, каб яго выхаванцы не толькі павышалі прафесійнае майстэрства, але і дасканала авалодвалі рознымі дысцыплінамі.

Гады вучобы ў гэтай акадэміі сталі для Альхімовіча асабліва плённымі. Ён шмат выстаўляўся на розных выставах, прымаў удзел у творчых конкурсах. Атрымаў некалькі залатых і сярэбраных медалёў. А затым былі гады, праведзеныя ў Францыі, у тым ліку і ў Парыжы. У горадзе, дзе, здавалася б, калі ты маеш хоць маленькія задаткі таленту, нельга не маляваць. Тут лунаў дух вялікіх папярэднікаў, прадстаўнікоў не толькі французскага народа, але і іншых, каго гасцінная Францыя прытуліла, прыгалубіла, стварыла спрыяльныя ўмовы для працы. Як тут было не маляваць?! Прыгадваў парады Герсана, па-новаму задумваўся над урокамі Вагнера, атрымаў магчымасць наведваць майстэрні сучасных яму славутасцяў. Жыў і ў Авоне, у Фантэбло, дзе кіраваў мастацкай майстэрняй.

У 1878 годзе Альхімовіч вярнуўся ў Варшаву. Праз два гады пачаў выкладаць малюнак у школе жывапісу і разьбы Б.Пасвіковай. Пасля вяртання заявіў аб сабе як майстар гістарычнага жанру. Менавіта 80-і гадамі пазначаны многія яго творы, што даюць усе падставы гаварыць пра Альхімовіча як пра першапраходцу ў беларускім жывапісе на гэтым накірунку.

Безумоўна, і да яго рабіліся пэўныя подступы для асэнсавання мінуўшчыны. Не ў апошнюю чаргу, напрыклад, Янам Траяноўскім, Януарыем Сухадольскім і іншымі мастакамі, таксама ўраджэнцамі Гродзеншчыны. Але згаданых аўтараў цікавіла гісторыя ўвогуле. Яны адлюстроўвалі даўнія падзеі, незалежна ад таго, дзе тыя адбываліся. Іншая справа Альхімовіч. Яго вабіла найперш гісторыя Вялікага княства Літоўскага, а калі канкрэтней — беларуская мінуўшчына.

Шкада, што далёка не ўсе работы, у якіх мастак прыглядаўся да даўніх падзей на роднай зямлі, дайшлі да нас. У тым ліку і "Смерць Міхаіла Глінскага ў цямніцы", а яна выстаўлялася ў 1885 годзе на акадэмічнай выставе ў Пецярбургу. Твор выклікаў тады шырокі рэзананс, на яго адгукнуліся многія знаўцы выяўленчага мастацтва. Пацвярджэнне таму публікацыі, што з'явіліся ў газетах Пецярбурга і Варшавы. Па іх і можна ў агульных рысах меркаваць аб сюжэце карціны.

Альхімовіч, як відаць з назвы твора, звярнуўся да апошніх дзён вядомага дзяржаўнага дзеяча і палкаводца... XVI стагоддзя. Сёння імя Глінскага пакрыце вяртаецца з небыцця, і многія ведаюць пра яго як пра слаўнага воя, што перамог татарскіх захопнікаў пад Клецкам. Вядома і тое, наколькі супярэчлівая гэта фігура ў нацыянальнай гісторыі. Калі ж Альхімовіч браўся за пэндзаль, пішучы палатно пра Глінскага, гэтага дзеяча ведалі хіба гісторыкі. З боку Альхімовіча гэта быў і грамадзянскі ўчынак.

Думаецца, мастак невыпадкова засяродзіўся на тых днях, калі жыццё Глінскага вісела на валаску. У такія крытычныя моманты чалавек лепш раскрываецца. Яму ўжо няма чаго баяцца, акрамя смерці. Альхімовіч паказаў Глінскага ў пакутлівым роздуме над пражытым. І хоць на твары відавочныя сляды болю — і фізічнага, і маральнага, бунтар (а толькі гэтым словам можна вызначыць яго характар) не скарыўся. Не мог скарыцца, бо ведае сабе цану, як знае і тое, што, знішчыўшы яго, ворагі ніколі не знішчаць вольнасці.

Вабіла Альхімовіча і польская гісторыя. У Варшаве, у музеі Войска Польскага, захоўваецца ці не самае вялікае яго палатно (памер 186 на 272 сантыметры) "Абарона Ольштына". Чалавек валявы, нясканы ў цэнтры ўвагі мастака ў карціне "Падрыхтоўка да смерці Самуіла Зборойскага".

"Вясельныя ўрачыстасці Жыгімонта Аўгуста" і "Апошні жрэц Літвы з дачкою Плёнтай", і партрэты Паўла Яна Сапегі, Крыштофа Радзівіла — таксама гісторыя.

Разам з тым вабілі яго і сюжэты з сучаснасці. Гэта было і вяртанне да падзей паўстання 1863 года, праўда, у нечым ускоснае — "На этапе", "Пахаванне на Урале", "Смерць у выгнанні". Адлюстроўваў Альхімовіч і вясковы побыт — "Вясковая дзяўчына", "Жніво", "Наём работнікаў", "Хата селяніна", "Дажынкі"...

Дарэчы, у станковым жывапісе ён дасягнуў найбольшага поспеху, аднак талент меў куды больш шырокі. Спрабаваў сілы і ў графіцы. Разам з Т.Попелем і А.Пятроўскім распісваў касцёл святой Кацярыны ў Пецярбургу. Займаўся разьбой па дрэве. Не чужой была ў яго ўмелых руках і гліна, распісваў фаянс. Ілюстраваў "Пана Тадэвуша" А.Міцкевіча.

Творчым дарам абдзелены не быў. Ды і жыццёвым лёсам, не сказаць, каб пакрыўджаны. Ссылка, канечне, не мёдам аказалася, а ў астатнім... Дажыў да глыбокай старасці, памёр 31 снежня 1916 года. У 1908 годзе, калі раптоўна з'явіла жаданне падвесці рысу над пражытым, з вялікай ахвотай і натхненнем узяўся "аплачваць" яшчэ адну даніну Бацькаўшчыне, ствараючы палотны, прысвечаныя землякам. Тым самым набыў, па сутнасці, другое мастакоўскае дыханне.

Міхась ЯНОВІЧ.

Пра Казіміра Альхімовіча можна прачытаць у кнізе:
Дробов Л. Живопись Белоруссии XIX — начала XX в. Мн., 1974.

БОЛЬШОЙ КОЛХОЗ

(Окончание. Начало на 1-й стр.)

Все мы ждем и желаем улучшения дел в сложнейшей отрасли народного хозяйства. Уверен, что никаких улучшений ждать не надо, их не будет до тех пор, пока государство не даст сельхозпроизводителю экономической и юридической свободы, пока не сделает его хозяином своего дела. Только хозяин производства может эффективно им управлять. А хозяином он становится тогда, когда ему принадлежат основные и оборотные средства производства, в том числе и земля как основное средство производства. Нынешняя власть превратила большинство руководителей хозяйств и технологов производств в безынициативных покорных исполнителей. Все в их деятельности расписано сверху: сколько и чего посеять, кому и сколько продать, куда и сколько отдать вырученных денег. Вот главная причина глубокого кризиса общественного сельскохозяйственного производства республики. Вот почему год от года все больше и больше на прилавках магазинов мы видим привозных продуктов питания. Когда это было, чтобы из России в Беларусь завозили молоко, масло, сыры, мясо и мясные продукты? Семь лет назад десятки тысяч тонн молочных и мясных продуктов (более 60% произведенных в Беларуси) вывозили за пределы республики, в основном в Россию.

